**Актуальна.** Адукацыйны семінар «Новая рэдакцыя Закона Рэспублікі Беларусь "Аб аўтарскім праве і сумежных правах"» адбыўся ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі напярэдадні Сусветнага дня кнігі і аўтарскага права і Міжнароднага дня інтэлектуальнай уласнасці. Арганізатарамі выступілі НББ і Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці (НЦІУ). Як гаворыцца на сайце бібліятэкі, семінар прайшоў у змешаным фармаце: больш за 40 чалавек прысутнічалі ў аўдыторыі і больш за 30 чалавек далучыліся анлайн. Асаблівую цікавасць у слухачоў выклікала выступленне Сяргея Лосева, вядучага навуковага супрацоўніка аддзела даследаванняў у галіне грамадзянскага, экалагічнага і сацыяльнага права Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь. У яго дакладзе «Праблема "сіроцкіх" твораў і магчымыя шляхі яе вырашэння» былі закрануты актуальныя пытанні класіфікацыі і выкарыстання «сіроцкіх» твораў у бібліятэках.